# Нашы юбіляры

## ЕФРАСІННЯ ЛЕАНІДАЎНА БОНДАРАВА

### (да 60-годдзя з дня нараджэння)



Споўнілася 60 год заслужанаму дзеячу навукі БССР, доктару філалагічных навук, прафесару універсітэта Ефрасінні Леанідаўне Бондаравай. Яна нарадзілася ў Віцебскай вобласці, у сялянскай сям'і. Пасля заканчэння Лёзненскай сярэдняй школы працавала ў раённым друку. У 1949 годзе скончыла аддзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна. У студэнцкія гады праявіла схільнасць да мастацтвазнаўчай дзейнасці, часта выступала на старонках беларускага друку як кінакрытык. Пасля заканчэння універсітэта Ефрасіння Леанідаўна нейкі час працуе галоўным рэдактарам Міністэрства культуры БССР. У 1953 годзе, пасля заканчэння аспірантуры, абараняе кандыдацкую дысертацыю па тэме «Борьба коммунистической партии за идейность искусства» і пачынае чытаць лекцыі ва універсітэце. Спачатку яна сумяшчае гэту працу з працай у Міністэрстве культуры БССР, а з 1961 года — штатны выкладчык факультэта журналістыкі. У 1962 годзе ёй прысвоена навуковае званне дацэнта кафедры тэорыі і практыкі савецкай журналістыкі. Пасля абароны доктарскай дысертацыі па тэме «Проблемы белорусского киноискусства и печать» у 1977 годзе Е. Л. Бондаравай прысвоена навуковае званне доктара філалагічных навук. З 1980 года Ефрасіння Леанідаўна Бондарава — прафесар кафедры тэорыі і практыкі савецкай журналістыкі БДУ імя У. І. Леніна. Яна распрацавала і чытае спецкурсы па літаратурна-мастацкай крытыцы, праблемам літаратуры і мастацтва ў друку, тэорыі і гісторыі кіно, вядзе спецсемінар па актуальным праблемам публіцыстыкі. Лекцыі Ефрасінні Леанідаўны вызначаюцца ідэйна-тэарэтычнай і навуковай глыбінёй.

Вучэбна-выхаваўчую дзейнасць Е. Л. Бондарава паспяхова сумяшчае з навукова-даследчай. Праблемы, якія цікавяць даследчыка,— узаемадзеянне сродкаў масавай інфармацыі і мастацтва, прынцыпы і жанры асэнсавання крытыкай з'яў мастацтва. Яна аўтар 5 манаграфій: «Очерк на экране» (сумесна з Л. Ф. Шылавай), «В кадре и за кадром», «Время, экран, критика», «Кино Советской Белоруссии», «Кинолента длиною в жизнь». Рыхтуецца да выдання яшчэ адна манаграфія — «Экран в разных измерениях», у якой аўтар імкнецца паказаць асаблівасці развіцця сусветнага кінематографа ў апошняе дзесяцігоддзе, праблемы і задачы крытыкі, месца беларускага кіно на сусветным экране. Е. Л. Бондаравай напісаны тры брашуры: «Белоруссия экранная», «В. В. Корш-Саблин», «Кино Белоруссии» (сумесна з А. В. Красінскім); раздзелы ў навуковых зборніках «За газетным радком», «Праблематыка газетных выступленняў», падрыхтаваных калектывам кафедры тэорыі і практыкі савецкай журналістыкі. Яна супрацоўнічае з многімі саюзнымі і беларускімі часопісамі: «Искусство кино», «Советский экран», «Коммунист Белоруссии», «Полымя», «Неман», «Беларусь», «Маладосць».

Прафесар Е. Л. Бондарава актыўна ўдзельнічае і ў грамадскай дзейнасці. Доўгі час узначальвае Савет НДРС на факультэце, кіруе гуртком літаратурна-мастацкай крытыкі, з'яўляецца членам партбюро факультэта, членам праўлення Мінскай арганізацыі Саюза журналістаў БССР, старшынёй камісіі літаратурна-мастацкай крытыкі Саюза журналістаў БССР, старшынёй секцыі тэорыі кіно і кінакрытыкі Саюза кінематаграфістаў БССР, членам усесаюзнай камісіі тэорыі і кінакрытыкі Саюза кінематаграфістаў СССР, членам камітэта пры Савеце Міністраў БССР па прысуджэнню Дзяржаўных прэмій у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры, членам Савета па культуры Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, членам мастацкага савета кінастудыі «Беларусьфільм», старшынёй метадычнага савета Бюро прапаганды кінамастацтва.

Галоўнае ў сваёй выхаваўчай і навуковай дзейнасці Е. Л. Бондарава бачыць у тым, каб абудзіць у чалавеку інтарэс да даследавання, дапамагчы адбыцца цікавай асобе. Сярод яе вучняў — кінарэжысёры І. Дабралюбаў, В. Дашук, Р. Ясінскі, М. Заслонава, журналісты Г. Цвяткова, С. Алексіевіч, Н. Калеснік, доктар мастацтвазнаўства А. Сабалеўскі.

За заслугі ў развіцці навукі і выхаванні журналісцкіх кадраў Ефрасінні Леанідаўне Бондаравай прысвоена званне заслужанага дзеяча навукі БССР, яна ўзнагароджана Ганаровай Граматай Вярхоўнага Савета БССР, Ганаровым знакам Міністэрства вышэйшай адукацыі СССР «За отличные успехи в работе», Ганаровым знакам «Отличник кинематографии».

Калегі па працы віншуюць Ефрасінню Леанідаўну з важнай датай у жыцці, жадаюць здароўя, плёну ў працы.

## ФЕДОР ИВАНОВИЧ КУЛЕШОВ

### (к 70-летию со дня рождения)



18 июня исполняется семьдесят лет Федору Ивановичу Кулешову — доктору филологических наук, профессору нашего университета, одному из крупнейших литературоведов республики, известному специалисту по истории русской литературы XIX—XX веков, литературному критику, члену Союза писателей СССР.

Ф. И. Кулешов родился в крестьянской семье, в деревне Большие Стрелки Рогачевского района (ныне Гомельская область). В семь лет остался сиротой. В 1925 году родственники отдали его в детский дом в Бобруйске. Потом был детский дом и школа в Пиревичах. После окончания девятилетки (1931) работает в районной газете «Камунар», одновременно являясь собкором республиканской газеты «Савецкая Беларусь». Много пишет и читает, упорно и сосредоточенно занимается самообразованием, посещает вечерний комвуз. Осенью 1933 года двадцатилетний Федор Кулешов едет в Ленинград и поступает на филфак областного пединститута. Зачисленный в группу ускоренного изучения учебной программы, он через два года кончает институт и добровольно уезжает учительствовать в Заполярье, в Кировск. Там вплоть до войны Федор Иванович преподает в средней школе русский язык и литературу и активно сотрудничает в печати. Работая, он продолжал учиться заочно в Ленинградском госпединституте имени А. И. Герцена.

Хотя по состоянию здоровья еще задолго до войны Федор Иванович был снят с воинского учета, он в 1941—1943 годах работает в трудармии и служит писарем на военно-пересыльном пункте в Челябинске. В феврале 1944 года становится преподавателем в одном из челябинских вузов. В первую послевоенную осень Федор Иванович был принят в Кустанайский учительский институт на должность старшего преподавателя, а затем избирается заведующим кафедрой русского языка и литературы. Экстерном сдал кандидатские экзамены. Самостоятельно подготовил и в 1949 году защитил в Ленинграде кандидатскую диссертацию «Ранний Куприн». В том же году ему было присвоено звание доцента.

С августа 1951 года Федор Иванович — доцент БГУ. По совместительству некоторое время был старшим научным сотрудником института литературы АН БССР. Систематически печатается. В 1955 году принят в члены Союза писателей. В 1956 году Федор Иванович уезжает на Сахалин, где в течение пяти лет заведует кафедрой открытого там пединститута. В Минск вернулся в 1961 году и с тех пор непрерывно работает в БГУ. Защитил в 1964 году докторскую диссертацию по творчеству А. И. Куприна. Стал профессором. В 1966—1969 годах возглавлял кафедру русской классической литературы.